**Велікодныя віншаванні прэзідэнцкай пары**
**вернікам Праваслаўнай Царквы, Грэка-каталіцкай ды іншых Усходніх Цэркваў**

Шаноўнае спадарства!
Паважанае духавенства і дарагія вернікі Праваслаўнай Царквы, Грэка-каталіцкай Царквы ды іншых Усходніх Цэркваў!

З нагоды Уваскрэсення Хрыстова прыміце сардэчныя віншаванні і найлепшыя пажаданні. Няхай гэтыя асаблівыя дні прынясуць вам як мага больш адпачынку, міру, новай надзеі і духоўнага адраджэння.

Мы верым, што прыгожыя царкоўныя абрады, а таксама велікодныя звычаі, якія культывуюцца пакаленнямі, умацуюць адзінства вашых сем’яў і прыходскіх абшчын. Няхай па заканчэнні Вялікага посту зноў надыдзе час святкавання ў коле сваякоў, сяброў і суседзяў.

Прыўзнятую атмасферу гэтага Вялікадня парушаюць драматычныя паведамленні з-за нашай усходняй мяжы. Многія з вас прымаюць пад свой дах бежанцаў з Украіны, якая змагаецца за свабоду.

Шчыра дзякуем вам за аказаную ім сардэчнасць. Гэтая салідарная дапамога і добразычлівасць з’яўляюцца надзвычай важным сведчаннем веры і чалавечнасці.

Мы ўсе прагнем справядлівага і трывалага міру для краіны, якая 1034 гады таму разам са сваім уладаром Святым Уладзімірам прыняла хрышчэнне паводле візантыйскага абраду.

Зычым вам, каб Вялікдзень прынёс узаемную добразычлівасць і надзею! Усяго найлепшага!

З Вялікаднем!